**Куліковіч У.І. (Мінск, Беларусь)**

# Састаў і структура слоўніка “Ужыванне і напісанне прыставак/часціц не (ня), ні (ані)”

У сучаснай лексікаграфічнай практыцы ўсходнеславянскага мовазнаўства, якая бярэ адлік з XIX ст., калі распачалося выданне рускамоўных арфаграфічных слоўнікаў, вызначыліся чатыры тыпы такіх выданняў у адпаведнасці з іх накіраванасцю: школьныя арфаграфічныя слоўнікі, арфаграфічныя слоўнікі-даведнікі для работнікаў друку, арфаграфічныя галіновыя даведнікі спецыяльнай тэрміналогіі, агульныя арфаграфічныя слоўнікі, разлічаныя на масавага чытача, у тым ліку прысвечаныя асобным арфаграфічным праблемам: ужыванне вялікай і малой літары, напісанне разам, асобна, праз злучок і інш.

У беларускай лексікаграфіі маюцца арфаграфічныя слоўнікі толькі двух тыпаў: агульныя, разлічаныя на ўсіх, і школьныя, “па правільнай і аднастайнай перадачы пісьмовай мовы і прызначаны садзейнічаць засваенню вучнямі правапісных норм сучаснай беларускай літаратурнай мовы” [1]. Іншым разам адзін і той жа арфаграфічны слоўнік пры перавыданні прызначаецца для рознай чытацкай аўдыторыі. Напрыклад, тып “Арфаграфічнага слоўніка” 2002 г. [2] – агульны, а перавыдадзенага ў 2005 г. для пераможцаў гульні-конкурса “Буслік–2005”, – школьны [2].

Слоўнік-даведнік “Ужыванне і напісанне прыставак/часціц не (ня), ні (ані)”, які рыхтуецца да выдання на кафедры рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій БДТУ, адрасаваны найперш работнікам СМІ і рэдакцыйна-выдавецкіх устаноў. Ён уключае каля 3000 слоўнікавых артыкулаў, дзе прадстаўлены шматлікія канкрэтныя ўзоры напісання слоў з прыстаўкамі / часціцамі *не* (*ня*), *ні* (*ані*), у тым ліку і складаныя, не вызначаныя правіламі выпадкі, што сустракаюцца ў карэктарскай і рэдактарскай практыцы. Напрыклад, *небагата* і *не багата*, *не стае* і *нестае*: *Жылі суседзі* ***небагата*** (У. Дамашэвіч); *У аўтобусе пасажыраў* ***небагата*** (Ф. Янкоўскі); *У нас, я адчуваю,* ***небагата*** *часу* (А. Беланожка), але *Да цябе* ***не багата*** *хады, / Толькі хто дабрыдзе-дападзе* (Р. Барадулін); *Пад лесам жыла сямейка.* ***Небагата*** *і не бедна, дзень і ноч працавала, без хлеба не ела* (В. Быкаў). *Мне цябе* ***не стае$_2$*** *быццам мору прыбою, / Ветру – ветразям, ранню – барвовай зары* (В. Лукша); *Цяпер Гусоўскі асабліва балюча адчуваў, як яму* ***не стае*** *Эразма* (У. Арлоў); *У іх мове вельмі мала паняццяў і ўяўленняў,* ***не стае*** *таксама многіх слоў* (Ж. Некрашэвіч-Кароткая).

Мэта і задачы слоўніка вызначылі яго структуру і пабудову слоўнікавых артыкулаў.

1. Слоўнік складаецца з трох частак: “Словы з прыстаўкамі / часціцамі не (ня)”, “Словы з прыстаўкамі / часціцамі ні (ані)”, “Правілы напісання і ўжывання прыставак / часціц не (ня), ні (ані)”.

2. Асноўны масіў слоўніка – агульнаўжывальная нейтральная лексіка. Аднак маецца пэўны працэнт слоў з розных сфер камунікацыі, які дазваляе рэдагаваць навуковую, навукова-папулярную, навукова-фантастычную літаратуру, артыкулы ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

масавым друку. Тэрміналагічная лексіка мае паметы, якія ўказваюць на сферу выкарыстання (*юр.* – юрыспрудэнцыя, *заал.* – заалогія, *астр.* – астраномія).

3. У слоўніку таксама адлюстравана стылістычная і тэрытарыяльная дыферэнцыяцыя беларускай мовы. Словы, абмежаваныя ў сваім ужыванні стылістычна або тэрытарыяльна, маюць адпаведныя паметы: *афіц.* – афіцыйнае, *кніжн.* – кніжнае, *разм.* – размоўнае.

4. Словы ў слоўніку размешчаны парамі ў алфавітным парадку і пішуцца вялікімі літарамі: **НЕАРГАНІ́ЧНЫ** і **НЕ АРГАНІ́ЧНЫ**, **НЕАСЦЯРО́ЖНАСЦЬ і НЕ АСЦЯРО́ЖНАСЦЬ**, **НЕЖЫВЫ́** *і* **НЕ ЖЫВЫ́ , НЕЛАСКА́ВАСЦЬ і НЕ ЛАСКА́ВАСЦЬ.**

5. У словах (акрамя аднаскладовых) і словаформах абазначаны націскныя склады. У тых выпадках, дзе назіраецца варыянтнасць, стаяць два націскі. Літара *ё* ўказвае на месца націску, таму ў словах або словаформах з літарай *ё* значок націску не ставіцца.

6. Вымаўленчыя, граматычныя і славаўтваральныя варыянты слоў, якія адрозніваюцца напісаннем, падаюцца ў асобных слоўнікавых артыкулах: **НЕАБВЕ́РЖНА** і **НЕАБВЯРГА́ЛЬНА, НЕАБСТРАЛЯ́НЫ** і **НЕАБСТРЭ́ЛЕНЫ, НЕАБЧАСА́НЫ** і **НЕАБЧЭ́САНЫ, НЕАБЫЯ́КІ** і **НЕАБЫЯКІ́, НЕАПРА́ЎДАНЫ** і **НЕАПРАЎДА́НЫ, НЕАРА́НЫ** *і* **НЯВОРАНЫ.**

7. У састаў слоўніка ўключаны фразеалагізмы; іх алфавітнае размяшчэнне вызначана першым словам пасля часціц *не/ні* (*ані*): **НЕ ЗА БЛІЗКІ СВЕТ, НІ АДСЮ́ЛЬ НІ АДТУ́ЛЬ, НІ БЭ НІ МЭ, НІ ДОМА НІ ЗА́МУЖАМ.**

8. Формы слоў даюцца ўсечана, пачынаючы з той літары ўсечанага слова, пасля якой змяняецца напісанне слова або з якой змяняецца націск у словах з рухомым націскам; пры гэтым незмяняльная частка слова замяняецца дэфісам: **НЕДАСЫ́ПАЦЬ,** *-плю, -плеш, -пле, -плем, -плеце, -плюць, зак.*; **НЕДАСЫПА́ЦЬ,** *-а́ю, -а́еш, -а́е, -а́ем, -а́еце, -а́юць, незак. да* **НЕДАСЫ́ПАЦЬ**.

9. Тыповы слоўнікавы артыкул уключае наступныя зоны:

загалоўныя словы, размешчаныя паралельна, у два слупкі;

граматычныя звесткі пра загалоўныя словы;

характарыстыка загалоўных слоў (значэнне) з пункта погляду ўжывання і стылістычнай афарбоўкі;

значэнне слова;

прыклады, што ілюструюць ужыванне слова (значэння) у тым ліку і ўстойлівых словазлучэнняў, выбраныя з разнажанравых і разнастылёвых тэкстаў.

<table>
<tr><td>НЕАБАВЯЗКО́ВЫ, -ая, -ае, прым.</td><td>НЕ АБАВЯЗКО́ВЫ, -ая, -ае, прым.</td></tr>
<tr><td colspan="2">1. Які не з’яўляецца абавязковым, неабходным для выканання.<br>2. Які не заўсёды павінен быць, не заўсёды прысутнічае.</td></tr>
</table>

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

| | |
|---|---|
| ***Неабавязковыя*** *прыметы байкі – звяры ў якасці дзеючых асоб і вершаваная форма* (В. Рагойша). *Куплеты – неабавязковая прыналежнасць вадэвілю* (В. Рагойша). ***Неабавязковы*** *план.* ***Неабавязковы*** *прадмет.* | *Рэферэндум па адмене смяротнага пакарання зусім* ***не абавязковы*** («Наша ніва»). *І тут жа глыбокі, ад абуджанага пачуцця, роздум,* ***не абавязковы****, магчыма, для іншага чалавека, але абавязковы для мастака* (В. Карамазаў). |

10. У слоўнік уключаны фразеалагізмы-канструкцыі з адмоўем *не* пры ўсіх кампанентах, акрамя дзеяслоўных, паколькі, як вядома, *не* з дзеясловамі пераважна пішацца асобна:

з назоўнікавымі кампанентамі: НЕ КАМПАНІЯ;

з займеннікавымі: НЕ НАШАГА БОГА;

з прыслоўнымі: НЕ ТУДЫ ХАТА;

з прыметнікавымі: РАД НЕ РАД;

з прыназоўнікава-склонавымі формамі назоўнікавага ці займеннікавага кампанента: НЕ ПА САБЕ, НЕ Ў МЕРУ, НІ З МЕСЦА.

11. Назоўнікі даюцца ў назоўным склоне адзіночнага ліку з указаннем формы роднага склону адзіночнага ліку. У асобных выпадках указаны формы наступных склонаў:

а) назоўны і родны склоны множнага ліку – калі ў мове сустракаюцца варыянты;

б) давальны, творны і месны склоны адзіночнага і множнага ліку – калі маюцца фанетычныя змены:

| **НЕДАПЛА́ТА**, *-ы*, ДМ *-лаце, ж. р.* | **НЕ ДАПЛА́ТА**, *-ы*, ДМ *-лаце, ж. р.* |
|---|---|
| Значэнне непаўнаты дзеяння: няпоўная выплата; недаданая частка плацяжу | |
| *У параўнанні з мінулым годам колькасць асабістых рахункаў з недаплатай зменшылася на 15 тыс. руб., а сума недаплаты – 2,5 млрд руб* (“Звязда”) | ***Не даплата*** *патрэбна табе, а пазбаўленне ўсіх прэмій на год* (У. Сіўчыкаў) |

12. Дзеясловы даюцца ў неазначальнай форме з указаннем канчаткаў 1 і 3 асобы. Калі іншыя асабовыя формы дзеяслова адрозніваюцца па ўтварэнні ад 3 асобы адзіночнага ліку, то прыводзяцца і гэтыя формы. У асобных выпадках указаны асабовыя формы дзеяслова, якія могуць выклікаць арфаграфічныя цяжкасці: **НЕДАПЛАЦІЦЬ,** *недаплачу, недаплаціш, -ціць, -цім, -ціце, -цяць, зак.*

13. Калі слова без “не” не ўжываецца, то ў слоўніку маецца ўказанне на гэта: **НЕАБВЕ́РЖНА,** *прысл., без “не” слова не ўжываецца.* Бясспрэчна. *Факты* ***неабвержна*** *сведчаць, што гэта так* (“Звязда”). *Навукоўцы адзінадушна, цяпер гэта ўжо відавочна і* ***неабвержна****, схіляюцца зараз да больш трывожных ацэнак глабальных перспектыў* (“Новы час”).

14. Паколькі адна з задач слоўніка навучальная, то ў ім змешчаны:

а) злучнікі і займеннікі, якія пішуцца з “не” асобна: **НЕ Я́К…, А…** *злучн. Не як сапраўдны цар, а як акупант ён паводзіў сябе на нашых землях* (М. Бугай); *Паранены Іосіф павольна, але набіраўся моцы-мацунку. Толькі не як у казцы, а марудней*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(Ф. Янкоўскі); **НЕ ЯКІ-НЕ́БУДЗЬ,** *займ.* ***Не які-небудзь,*** *а ўсё ж такі казённы!* (В. Волат)

б) асобныя дзеясловы з часціцай “не” і прыстаўкай *да-*, якія падчас вымаўлення можна зблытаць з прыстаўкай *неда-*: **НЕ ДАГАДЗІ́ЦЬ, НЕ ДАЖЫЦЬ, НЕ ДАЗНА́ЦЦА, НЕ ДАКАРА́ЦЬ, НЕ ДАКУМЕКАЦЬ, НЕ ДАЛЯЦЕЦЬ, НЕ ДАРАВА́ЦЬ, НЕ ДАЦЯГНУЦЦА, НЕ ДАЦЯМІЦЬ**.

в) інфармацыя пра дзеясловы, якія могуць ўжывацца без “не”, але пры гэтым маюць іншае значэнне. Напрыклад, школьныя вучэбныя дапаможнікі сцвярджаюць, што дзеяслоў ***непакоіцца*** пішацца з “не” разам, бо ён без “не” не ўжываецца. Аднак гэта не адпавядае рэальнасці: *Яраслаўна заплача па новаму Ігару, / Сумны голас* ***пакоіцца*** *шалямі рэк* (П. Панчанка). *У глыбокім маўчанні стаялі воіны-афганцы, прадстаўнікі райвыканкама, ваенкамата ля магіл, дзе* ***пакоіцца*** *прах нашых землякоў* («Ашмянскі веснік»).

Такім чынам, Слоўнік-даведнік “Ужыванне і напісанне прыставак / часціц не (ня), ні (ані)” прысвечаны адной арфаграфічнай праблеме, дакладна акрэсленай у назве кнігі. Сваімі саставам і структурай будзе ён з’яўляцца першым у нашай краіне лексікаграфічным выданнем, адрасаваным работнікам рэдакцыйна-выдавецкіх устаноў і арганізацый.

Асобныя матэрыялы, змешчаныя ў слоўніку, безумоўна, могуць быць выкарыстаны педагогамі для арганізацыі вучэбнага працэсу ў агульнаадукацыйных установах, установах вышэйшай адукацыі, а таксама ва ўстановах дадатковай адукацыі, вучнямі для падрыхтоўкі да экзаменаў і ЦТ.

Даведнік прызначаны паспрыяць выпрацоўцы пэўных тыпаў арфаграфічнага слоўніка, стварэнню лексікаграфічнай тэорыі, якія нельга лічыць канчаткова складзенымі і ў нашы дні.

Літаратура


1. Беларускі арфаграфічны слоўнік для школьнікаў / уклад. Л. П. Кунцэвіч, І. У. Кандраценя, пад рэд. А. А. Лукашанца. – Мінск : Аверсэв, 2010 – 245 с.
2. Арфаграфічны слоўнік: [каля 30000 слоў сучас. бел. мовы: Правапіс. Словазлучэнне. Вымаўленне / склад. Н. С. Лявер. – Мінск : ТАА “Парадокс”, 2002. – 365 с.
3. Арфаграфічны слоўнік: [каля 30000 слоў / складальнік Н. С. Лявер ; навук. рэд. М. Р. Прыгодзіч]. – Мінск : Конкурс, 2005. – 365 с.


РЭПОЗІТОРЫЙ БГПУ